Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# Як звяркі Восень сустракалі

Надышлі першыя асеннія дзянькі. Заяц Вушасцік, вавёрачка Адважка, вожык Пыхкунок, янот Цішка, сяброўкі-вавёркі Хітрына і Весялінка, сінічка Маняша і іншыя звяркі і птушкі сабраліся каля ляснога ручая. Палянка была ўпрыгожана рознакаляровымі шарыкамі, кветкамі, лісцікамі. Звяркі віталі госцю Восень. Яны счапіліся лапкамі і заспявалі песеньку:

*Восень, восень, восень,*
*цябе ў госці просім.*
*Ты прыходзь з дарамі,*
*шчырымі сябрамі,*
*з дождыкам лагодным,*
*з раніцай халоднай,*
*з ветрыкам не злосным,*
*з срэбранымі росамі,*
*з сонейкам і хмаркамі,*
*з лужынамі ў парках…*
*Ды забавак сыпані –*
*і ў шэрыя дзянькі*
*нас, звяркоў, павесялі.*

Раптам над палянкай пачаў падаць рознакаляровы дождык. Вожык Пыхкунок адразу раскрыў парасонік. Але ён не спатрэбіўся, таму што гэты чароўны дождык быў не мокры. Восень проста сыпала канфеці і радавалася, што яе вітаюць. У небе калыхалася сонца. Звяркі танчылі, скакалі, куляліся.

— Пачула нас восень! — усклікнула вавёрачка Весялінка.

— Ура! Пачула, пачула!

— Прыйшла! — радасна гаманілі звераняты.

У гэты момант на дрэвах зазіхацелі жоўтыя, барвовыя, рыжыя лісцікі.

Яны шапацелі, трапяталі, ціха асыпаліся на зямлю. Быццам яркі дыван, ляжалі пад дрэвамі. А потым наляцеў моцны вецер і пачаў зрываць апошняе лісце. Узняліся ў неба паветраныя шарыкі і кветкі. Сыпануў халодны дождж, град. Звяркі кінуліся хавацца пад кусцікі і дрэвы. Са сваіх схованак яны расчаравана пазіралі на гэтыя з'явы. І толькі мудрая вавёрачка Адважка патлумачыла гэтыя свавольствы восені:

— Так, восень прыйшла. І толькі што яна паказала нам, як будзе валадарыць. Спачатку ціха, сонечна і прыгожа. Потым хопіць усяго: і дажджу халоднага, і ветру, і шэрых маркотных дзён. Так, як і заўсёды бывае.

Хутка непагадзь скончылася. Над палянкай зноў заззяла сонейка. Усё вярнулася на месцы. Дрэвы як былі апрануты ў лістоту, так і заставаліся. Толькі што гэта? Па ўсёй палянцы — то тут, то там — звяркі ўбачылі кошычкі. Яны былі поўныя грыбоў, арэшкаў, ягад, жалудоў, карэньчыкаў, капусты, морквы, яблыкаў, розных зярнятак і гароху. А пасярод ляжаў пузаты гарбуз.

— Гэта падарункі ад восені! Яна нас частуе! — здагадаўся зайчык Вушасцік і паскакаў да кошычка з капустай.

— Так! Так! Будзем частавацца!

*Малюнак*
*Анастасіі ПЕРАХРОСТ*

